Зямля і справа сям'ю кормяць

Віртуальнае падарожжа па... Вялікай Айчыннай

СТАР. 6

Быць шчаслівым — гэта талент

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

13 КРАСАВІКА 2016 г. СЕРАДА № 68 (28178) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АРЫЕНТАЦЫЯ — У БУДУЧЫНЮ

Краіна выходзіць на якасна новы этап у развіцці сістэмы сувязі

Фота БЕЛТА.

Беларусь мае намер ісці па шляху інтэграцыі ў сусветную інфармацыйную прастору, развіваючы Нацыянальную сістэму спадарожнікавай сувязі і вяшчання. Адпаведныя задачы вызначыў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання цэнтра касмічнай сувязі ў пасёлку Станькава Дзяржынскага раёна, паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

«У свой час мы пачыналі з аказання паслуг па стварэнні спадарожнікаў для іншых краін. Зараз мы ў кааперацыі можам стварыць гэтую тэхніку самі, з чыёйсьці дапамогай даставіць у космас (касмадромы нам не патрэбныя). Спадарожнікам мы кіруем, прадукцыю ад яго атрымліваем і прадаём. Усё ў нашых руках», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўніку дзяржавы далажылі аб праекце па стварэнні Нацыянальнай сістэмы спадарожнікавай сувязі і вяшчання, які рэалізуецца ў адпаведнасці з кантрактам паміж кітайскай прамысловай карпарацыяй «Вялікая сцяна» і беларускім заводам дакладнай электрамеханікі. У студзені гэтага года з кітайскага касмадрома быў запушчаны беларускі камунікацыйны спадарожнік «Белінтэрсат-1».

Цяпер, адзначыў старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Сяргей Гурулёў, стаіць задача камерцыялізацыі спадарожніка для атрымання прыбытку ў далейшым. Пры гэтым дадзены перспектыўны праект арыентаваны не толькі на аказанне паслуг у сферы сувязі замежным партнёрам, але і на ўнутраны рынак, у тым ліку для патрэб арміі і іншых сілавых структур. Фактычна гаворка ідзе пра якасна новы этап у развіцці сувязі ў Беларусі. З запускам «Белінтэрсат-1» Беларусь увайшла ў прэстыжны спіс з крыху больш як трох дзясяткаў краін, якія маюць спадарожнік уласнай сістэмы сувязі.

Па словах Сяргея Гурулёва, самае аптымальнае — мець тры спадарожнікі, якія, знаходзячыся на геастацыянарнай арбіце, будуць пакрываць практычна ўсю тэрыторыю Зямлі. «Калі нам гэта сёння трэба і выгадна, то гэта дзяржаўная справа. Мы і стваралі гэты праект, каб ён акупіўся», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым падкрэсліў, што, як і ў іншых галінах, самае галоўнае — прадаць канчатковы прадукт і бачыць рынкі збыту для аказання адпаведных паслуг. «Калі будуць такія напрацоўкі, мы запусцім другі спадарожнік. Мабыць, ён патрэбны для больш надзейнай сувязі, — сказаў Прэзідэнт. — Гэты комплекс шматфункцыянальны і вельмі патрэбны для нашай краіны. Мы яго будзем развіваць. Вельмі рады, што для нашай моладзі ёсць такія рабочыя месцы. Гэтаму мы будзем надаваць першачарговую ўвагу».

У час размовы з супрацоўнікамі Наземнага комплексу кіравання Нацыянальнай сістэмы спадарожнікавай сувязі і вяшчання кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў свой час была пастаўлена задача па развіцці ў Беларусі касмічнай галіны. Тады было досыць шмат скептыкаў, якія лічылі, што ў гэтым няма неабходнасці. Але час усё расставіў па сваіх месцах, пацвердзіўшы правільнасць прынятага рашэння. «Мы пайшлі ў гэтую сферу для таго, каб развівалася нацыя. Араць зямлю, сеяць, прыбіраць мы навучыліся. Вырабляць складаны прадукт у прамысловасці мы таксама навучыліся. Але гэта не космас, гэта не атамная станцыя, гэта не Парк высокіх тэхналогій — тыя напрамкі, якія арыентаваны ў будучыню», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што па шляху развіцця перадавых напрамкаў пайшлі і ў многіх іншых галінах. У іх ліку медыцына, дзе асвойваюцца новыя высокатэхналагічныя віды аперацый. Пад патрабаванні сучаснасці адаптуецца і сфера адукацыі. «Гэта рашэнне было прынята для таго, каб нацыя жыла і, развіваючыся, была самай перадавой», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Вяртаючыся да тэмы касмічнай галіны, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэты напрамак, па сутнасці, дае штуршок развіццю цэлага шэрагу прадпрыемстваў: «Запуск спадарожніка, будаўніцтва цэнтра кіравання палётамі — гэта работа для многіх прадпрыемстваў і тысяч людзей. Гэта для мяне было галоўным, што мы будзем развіваць спадарожныя галіны».

СТАР. 2

■ Прыемная навіна

Сем пялёсткаў радасці

Маленькія гаспадары новага садка сустракаюць запрошаных на ўрачыстае адкрыццё.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Урачысты момант перадачы крыштальнага ключа.

Яслі-сад №50 на 230 месцаў адкрыўся ў адным з новых мікрараёнаў Барысава. Плануецца, што групы будуць цалкам укамплектаваны да пачатку будучага навучальнага года. Цяпер установу наведваюць 90 дзяцей.

— За паўтара года на Міншчыне з'явілася 6 новых дзіцячых садоў, хутка будзем адкрываць яшчэ адзін у вёсцы Бараўляны. А гэта сведчыць пра тое, што краіна жыве стваральнай працай, і бацькі, кожны на сваім рабочым месцы, уносяць лепту ў агульную справу, каб іх дзеці раслі ў годных умовах, — адзначыў падчас цырымоніі адкрыцця **старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА.**

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:

«Паступовае павышэнне пенсійнага ўзросту створыць перадумовы да таго, што колькасць занятых на рынку працы будзе павялічана. Толькі ў 2017 годзе нам спатрэбіцца каля 18 тысяч дадатковых рабочых месцаў. Задача, якую паставіў кіраўнік дзяржавы, — 50 тысяч новых рабочых месцаў штогод. Таму павелічэнне пенсійнага ўзросту не пагражае дэфіцытам рабочых месцаў. Павелічэнне колькасці занятых на рынку працы будзе садзейнічаць павелічэнню валавога ўнутранага прадукту. Акрамя таго, павышэнне пенсійнага ўзросту дасць магчымасць гарантавана падтрымліваць сударосіны сярэдняй пенсіі па ўзросце і сярэдняй заработнай платы на ўзроўні 40%. Апошнім часам гэта атрымлівалася ўсё цяжэй».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.04.2016 г.

Долар ЗША	19864,00	▼
Еўра	22706,00	▼
Рас. руб.	299,45	▲
Укр. грыўня	778,22	▼

■ Служба дапамогі

«ХУТКАЯ» БУДЗЕ ХУТКА

Ніводная вобласць не выконвае такой колькасці выклікаў, як адна мінская гарадская станцыя. Што яна ўяўляе сабой сёння і што павінен ведаць той, хто набірае 103?

Станцыя хуткай медыцынскай дапамогі Мінска мае 10 падстанцый, размешчаных у кожным раёне па прынцыпе 15-хвіліннай даступнасці па навакольнай тэрыторыі. Новая 10-я падстанцыя пачала працаваць не так даўно па адрасе вул. У. Галубка, 3. Там размясціўся ўнікальны будынак, які не мае аналагаў на постсавецкай прасторы — у ім прадугледжана магчымасць правядзення канферэнцый, а таксама навучання як уласна работнікаў службы «хуткай», так і іншых медыцынскіх работнікаў.

Па меры росту насельніцтва прырастае і колькасць брыгад, якіх ужо 158. Усе яны дзеляцца на фельчарскія, рэанімацыйныя, інтэнсіўнай тэрапіі, педыятрычныя і псіхіятрычныя. Штогод брыгады абслугоўваюць больш за 600 тысяч выклікаў (каля 100 тысяч з іх — да замежных і іншагародніх грамадзян).

«У апошнія гады істотна абнавіўся наш аўтапарк — 2/3 аўтамабіляў маюць камфортныя для пацыента ўмовы з кандыцыянерам для лета, ацяпленнем зімой і г.д. — адзначае **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце Мінскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Алег ВАРАБЕЙ.** — Належным чынам аснашчаны самі брыгады. Апаратуру, якой раней былі забяспечаны нават не ўсе рэанімацыйныя брыгады, сёння маюць у тым ліку і агульнапрофільныя: ёсць электракардыёграф, дэфібрылятар, апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх, апарат кантралявання кіслароду ў крыві, супрацьпёкавыя павязкі, гемастатычныя парашкі, шпрыцавыя дазатары і інш. Дарэчы, сучасныя брыгады могуць уводзіць лекі не толькі ў вену, але і ў косць, што вельмі важна ў экстранных сітуацыях, напрыклад пры траўмах».

СТАР. 2

■ Прамая лінія

Без афіцыйнага даходу — любыя расходы сумніўныя

Учора ў рэдакцыі газеты «Звязда» адбылася «прамая лінія» з начальнікам галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Міхаілам Міхайлавічам РАСОЛЬКАМ.

Фота Кастуся ДРОБАВА

Галоўным чынам спецыяліст адказваў на пытанні нашых чытачоў, якія былі звязаны з дзеяннем з першых дзён красавіка асобных падпунктаў Дэкрэта кіраўніка дзяржавы №7 «Аб прыцягненні грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты)». Тут маецца на ўвазе парадак абкладання падаходным падаткам даходаў у выглядзе працэнтаў, атрыманых па банкаўскіх укладах. Акрамя таго, спецыяліст патлумачыў нюансы адносін паміж бакамі пры арэндзе кватэр у прыватнікаў, а таксама расказаў пра асобныя моманты, што тычацца плацельшчыкаў збору на фінансаванне дзяржвыдаткаў.

Закрануў наш эксперт і тэму так званых заробкаў у канвертах, а таксама сітуацыю, калі чалавек афіцыйнага заробку не мае, але выдаткі ў апошняга — як у сур'ёзнага багацея.

Напрыклад, наш **чытач Андрэй Віктаравіч з Гродна** ўдакладняе, ці сапраўды банкі сёння павінны прадастаўляць інфармацыю ў падатковую службу аб тых сваіх кліентах, якія купляюць шмат валюты або маюць на дэпазітах вялікія сумы грошай, пры гэтым дакладная крыніца даходу невядомая? Аб якіх сумах у гэтых выпадках ідзе гаворка?

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ААН пачынаюцца сустрэчы з кандыдатамі на пасаду Генеральнага сакратара

У штаб-кватэры ААН распачаўся першы раўнд гутарак з кандыдатамі на пасаду Генеральнага сакратара арганізацыі, паведамляюць інфармагенцтвы. Працэс адбору новага Генеральнага сакратара звычайна праходзіў за зачыненымі дзвярыма, рашэнне прымалі некалькі ўплывовых дзяржаў з ліку пастаянных членаў Савета Бяспекі. Сёлета ўпершыню ў гісторыі кандыдаты на пасаду адміністрацыйнага кіраўніка ААН пройдуць сумоўе з прадстаўнікамі ўсіх дзяржаў-членаў. Сярод кандыдатаў Антоніу Гутэрыш (Партугалія), Ірына Бокава (Балгарыя), Наталля Герман (Малдова), Весна Пусіч (Харватыя), Даніла Цюрк (Славенія), Срджан Керым (Македонія), Ігар Лукшыч (Чарнагорыя) і Хелен Кларк (Новая Зеландыя). Слуханні працягнуцца тры дні. Сустрэчы з прэтэндэнтамі на пасаду Генеральнага сакратара ААН пройдуць таксама ў чэрвені.

ЗША адмовіліся даць гарантыі ненакіраванасці ЕўраППА супраць Расіі

ЗША і НАТА не дадуць юрыдычныя гарантыі таго, што сістэма проціпаветранай абароны ў Еўропе не накіравана супраць Расіі, бо гэта можа падарваць магчымасць развіваць сістэму ў адпаведнасці з пагрозамі, якія растуць. Пра гэта ў аўторак заявіў памочнік амерыканскага дзяржсакратара па кантролі за ўзбраеннямі і міжнароднай бяспецы Фрэнк Роўз.

Парламенцкая камісія Бразіліі прагаласавала за імпічмент прэзідэнту

У Бразіліі спецыяльная парламенцкая камісія па імпічменце падтрымала адхіленне прэзідэнта краіны Дылмы Русеф ад пасады. Згодна з нацыянальным заканадаўствам, вердыкт камісіі павінен быць вынесены на пленарнае пасяджэнне ніжняй палаты парламента. Як чакаецца, яна прагаласуе па пытанні імпічменту ў дачыненні да Русеф 17 красавіка. Нагадаем, у пачатку снежня мінулага года старшыня ніжняй палаты нацыянальнага парламента Эдуарду Кунья абвясціў аб пачатку разгляду імпічменту ў дачыненні да кіраўніка дзяржавы. Рашэнне спікера грунтавалася на запыце прадстаўнікоў апазіцыі, якія абвінавацілі Русеф у фінансавых парушэннях, якія, на іх думку, былі дапушчаныя пры размеркаванні бюджэтных сродкаў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Абама назваў уварванне ў Лівію сваёй галоўнай памылкай

План па развіцці сітуацыі ў Лівіі пасля таго, як прэзідэнт гэтай краіны Муамар Кадафі быў звергнуты, Барак Абама назваў непрадуманым. Наступствы дзяржаўнага перавароту прэзідэнт ЗША назваў памылкай. Пры гэтым ён заявіў, што на той момант лічыў уварванне ў Лівію правільным крокам. Прэзідэнцкія выбары ў ЗША адбудуцца 8 лістапада. Паўнамоцтвы Барака Абамы на пасадзе прэзідэнта ЗША заканчваюцца ў студзені 2017 года.

КОРАТКА

Кол-цэнтры па новых правілах увозу тавараў для асабістага карыстання пачнуць працаваць з 14 красавіка, паведаміў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір Арлоўскі. Нумары тэлефонаў можна будзе знайсці на афіцыйных сайтах Дзяржаўнага мытнага камітэта і ўсіх мытняў.

Магільны склеп князёў Паскевічаў, размешчаны на тэрыторыі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, адкрыўся для наведвання пасля працяглага перыяду рэстаўрацыі.

У Мінску павялічылі фіксаваныя тарыфы на водазабеспячэнне і водаадвядзенне, што прадастаўляюцца насельніцтву, якія забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на іх аказанне. Фіксаваны тарыф (без падатку на дабаўленую вартасць) на водазабеспячэнне складзе Br6 тыс. 875 за 1 куб.м. (раней — Br5 тыс. 400), водаадвядзенне (каналізацыя) — Br4 тыс. 530 (раней — Br3 тыс. 600).

■ Меркаванне

НЕКАЛЬКІ СЛОЎ МОГУЦЬ ЗМЯНІЦЬ ДЗІЦЯЧЫЯ ЛЁСЫ,

КАЛІ ЗАКОН СВОЕЧАСОВА АДАПТАВАЦЬ ПАД РЭЧАІСНАСЦЬ

Удасканаленне фармулёўкі толькі аднаго сказа з закона «Аб дзяржаўных выплатах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» зможа дапамагчы ўладкавацца ў сем'і некалькім сотням дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі. Ідэя тычыцца магчымасці неперапынення выплат на дзіця бацькам, што даглядаюць толькі свайго малога-інваліда і выказваюць жаданне паклапаціцца і пра іншых дзяцей, якім патрэбна ўвага.

— Закон не дазваляе бацькам, якія атрымліваюць грошы на малога-інваліда, працаўладкоўвацца. Такая мера прымалася ў інтарэсах дзіцяці, каб бацькі ўсю ўвагу і час аддавалі непаўналетняму і не пакідалі яго аднаго, сыходзячы на працу. Аднак рэчаіснасць прапануе іншыя ўмовы. У краіне з'явіліся так званыя прыёмныя сем'і, дзе чалавек, прыняты на працу ўпраўленнем адукацыі, увесь час знаходзіцца дома і выхоўвае дзяцей-сірот, — патлумачыла **Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчык сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама,** якая прапануе ўдасканаленне названага закона. *— Многія з тых, хто даглядае сваё дзіця-інваліда, змаглі б выхоўваць у хатніх умовах і дзяўчынку ці хлопчыка, забраўшы іх з інтэрнатнай установы, працуючы прыёмнымі бацькамі. Думаю, што ў такія сем'і мы маглі б накіраваць пэўную колькасць выхаванцаў інтэрнатаў.*

Калі фармулёўку сказа «Выплаты па догляду дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў не прызначаюцца і не выплачваюцца асобам, якія працуюць па працоўных дагаворах (кантрактах)», што знаходзіцца ў абзацы 3 артыкула 17 Закона «Аб дзяржаўных выплатах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», працягнуць словамі «за выключэннем асоб, якія працуюць прыёмнымі бацькамі дзяцей-сірот і тых, хто застаўся без бацькоўскай апекі», у краіне з'явяцца новыя магчымасці для развіцця сямейных формаў выхавання дзяцей сіроцкай катэгорыі, лічыць прадстаўніца Камітэта па адукацыі. Гэта маленькае выключэнне павінна тычыцца толькі асоб, прынятых на працу ў якасці прыёмных бацькоў.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

УВАГА, СЁННЯ — ПРАМАЯ ЛІНІЯ

Аб тэхнічнай інвентарызацыі і зямельных пытаннях

13 красавіка, у сераду, у рэдакцыі газеты «Звязда» адбудзецца **«прамая лінія» са старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі**

Андрэем Анатолевічам ГАЕВЫМ

Такім чынам, новыя правілы тэхнічнай інвентарызацыі і праверкі характарыстык нерухомай маёмасці ўступілі ў сілу сёлета з першых дзён красавіка. Адпаведная Інструкцыя была зацверджана 24 сакавіка 2015 года пастановай Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь №11.

Пытанні, якія тычацца гэтых новых правілаў, нюансаў ацэнкі дамоў і зямельных участкаў, а таксама ўсяго іншага, што звязана з зямельнымі надзеламі фізічных асоб, можна будзе задаць **13 красавіка з 12 да 13 гадзін па тэлефоне (8-017) 287-18-71.**

АРЫЕНТАЦЫЯ — У БУДУЧЫНЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт у ходзе размовы з працоўным калектывам запэўніў, што дзяржава працягне надаваць самую пільную ўвагу сацыяльным пытанням, у тым ліку працаўладкаванню моладзі, будзе забяспечваць прадастаўленне першага працоўнага месца для выпускнікоў ВНУ. «Ідучы на павелічэнне пенсійнага ўзросту, мы выдатна разумелі, што гэта запатрабуе дадатковых працоўных месцаў. Таму сёлета прынялі рашэнне аб стварэнні больш як 50 тысяч працоўных месцаў, — сказаў Прэзідэнт. — Мы ўсяляк, не гледзячы ні на якія рынкавыя прынцыпы, будзем патрабаваць ад кіраўнікоў і ствараць умовы для бізнесу, для таго, каб яны стваралі працоўныя месцы».

Асаблівая ўвага ў Беларусі надаецца і пытанню забеспячэння бяспекі. «Галоўнае для мяне — бяспека нашых грамадзян, нашага грамадства і абараназдольнасць краіны», — падкрэсліў беларускі лідар.

У гэтым напрамку актыўна працуюць айчынныя прадпрыемствы ВПК, ствараючы патрэбныя для Беларусі і запатрабаваныя на рынку сістэмы ўзбраення, у тым ліку ракетныя комплексы. «Таму не перажывайце за будучыню, бяспеку, абараназдольнасць нашай краіны. У нас дастаткова спецыялістаў, якія могуць ствараць сістэмы, здольныя супрацьстаяць любому саперніку. Свой кавалак зямлі мы заўсёды абаронім. Мы нічога свайго не аддадзім, але і чужога нам не трэба», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ў Станькаве таксама азнаёміўся з арганізацыяй жыллёва-бытавых умоў для супрацоўнікаў аб'екта, наведаўшы размешчаны побач з цэнтрам шматкватэрны дом, дзе створаны ўсе ўмовы для камфортнага пражывання.

ВЫВУЧЭННЕ НАСТУПСТВАЎ ЧАРНОБЫЛЯ ПРАЦЯГНЕЦЦА

Каля 4 млрд расійскіх рублёў выдаткавана на рэалізацыю чатырох праграм Саюзнай дзяржавы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Сёлета заканчваецца Праграма сумеснай дзейнасці па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС, пры гэтым не ўсе праблемныя пытанні вырашаны. Таму, калі навукоўцы выкажуцца на карысць працягу праграмы, яны будуць падтрыманы. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Гомелі журналістам паведаміў Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА:

— У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС велізарная шкода была нанесена эканомікам нашых краін і здароўю людзей. Гэта шкода магла быць значна большай, калі б не самаадданая работа ліквідатараў, якія зрабілі ўсё магчымае, каб прадухіліць распаўсюджванне гэтага згубнага працэсу.

Як паведаміў старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік, на Гомельшчыне з сельгасабароту было выведзена больш за 200 тысяч гектараў зямлі. Выселена 400 населеных пунктаў, адселена 100 тысяч жыхароў.

У межах Саюзнай дзяржавы ў 1998 годзе была прынята першая праграма па ліквідацыі наступстваў катастрофы. На гэты момант рэалізуецца чацвёртая. За гэты час была праведзена вялізная работа па рэабілітацыі і ўвядзенні ў гаспадарчы абарот забруджаных земляў, а таксама аздараўленні грамадзян, якія пацярпелі ў выніку аварыі. У тым ліку створаны высокатэхналагічныя цэнтры, дзе прайшлі лячэнне каля 15 тысяч чалавек. Акрамя таго, вывучаліся наступствы ўплыву чарнобыльскай катастрофы на прыроду і арганізм чалавека.

У межах першага дня журналісты прынялі ўдзел ва ўрачыстым адкрыцці адноўленага магільнага склепа князёў Паскевічаў у Гомельскім палацава-паркавым ансамблі, а таксама наведалі мемарыяльны комплекс на месцы канцлагера ў вёсцы Красны Бераг Жлобінскага раёна. У бліжэйшыя дні запланавана пабываць у Палескім дзяржаўным радыяцыйна-экалагічным запаведніку і познаёміцца з вынікамі дзейнасці РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека. Завершыць прэс-тур выніковая прэс-канферэнцыя дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоты.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

НЕКАЛЬКІ СЛОЎ МОГУЦЬ ЗМЯНІЦЬ ДЗІЦЯЧЫЯ ЛЁСЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Магчымасць захаваць атрыманне дзяржаўных выплат на роднае дзіця-інваліда (зараз гэтая сума складае 1 591 300 руб.) і дадаткова выхоўваць яшчэ і сірату, выгадна і дзяржаве, — падкрэсліла Зінаіда Вараб'ёва. *— Сямейная форма ўладкавання дзяцей заўсёды больш танная, чым іх знаходжанне ў любой дзяржаўнай установе. Напрыклад, на ўтрыманне дзіцяці ў доме-інтэрнаце патрэбна да 80 млн руб. у год. Такія сумы не ідуць ні ў якае параўнанне з выплатамі за працу прыёмных бацькоў і выдаткамі на ўтрыманне дяцей-сірот у сям'і. Да таго ж сірата ўваходзіць у сям'ю бадай што на ўсё гатовае. Не трэба выдзяляць памяшканне пад стварэнне дзіцячага дома сямейнага тыпу, не трэба купляць мэблю, бытавую тэхніку і г.д.*

Цяпер у Мінску выплаты, якія атрымліваюць бацькі на догляд за ўласным дзіцем-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў, выплачваюцца на 2728 дзяцей. Часта гэта вельмі цяжкія непаўналетнія, ад якіх сям'я не адмовілася і магла, і хацела б выхаваць не толькі свайго, але і сірату. Вось, напрыклад, ёсць мама, па адукацыі сацыяльны педагог. Яна выхоўвае двух дзяцей-інвалідаў, якія вучацца ў першым класе. Сама кіруе машынай, вельмі рухавая і дзелавітая, усюды паспявае з дзеткамі. З задавальненнем узяла б на выхаванне хоць бы аднаго сірату, але тады яна страціць выплаты на догляд за ўласнымі дзецьмі. І такіх бацькоў, якія жадаюць дапамагчы выхоўваць чужых дзетак, нямала. Трэба толькі даць ім шанц на гэта, удакладніўшы закон.

— Пытанне па захаванні выплат на дзіця бацькам, якія выхоўваюць свайго малога-інваліда, калі яны становяцца прыёмнымі для іншых дзетак, заслугоўвае ўвагі і знаходзіць разуменне ў дзяржаве. Можна сказаць, што, нягледзячы на сённяшнія цяжкія эканамічныя ўмовы, яно ўжо прапрацаваецца, — далучыўся да абмеркавання прапановы Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама **Алег ЛЯЎШУНОЎ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па працы і сацыяльных пытаннях.** *— Праект закона «Аб дзяржаўных выплатах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» уключаны ў план падрыхтоўкі законапраектаў на 2016 год. Думаю, пытанне аб захаванні выплат вырашыцца станоўча. Як толькі законапраект паступіць на разгляд, дэпутаты таксама актыўна ўключацца ў гэтую справу.*

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

«ХУТКАЯ» БУДЗЕ ХУТКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Памер сярэдняй заработнай платы ва ўрачоў «хуткай» складаў летась прыкладна 10 млн рублёў (пры каэфіцыенце сумяшчальніцтва 1,35), у сярэдняга медперсаналу — 7 млн (каэфіцыент — 1,15), у санітараў — 4 млн рублёў. Фактычна такі ж заробак захоўваецца і цяпер. Можа быць, гэта паспрыяла апошнім часам прытоку ў службу сярэдняга медперсаналу, хоць вакансіі фельчараў, санітараў ды ўрачоў таксама ёсць. Але гэта не адбіваецца на якасці паслуг. Усе работнікі службы дакладна ведаюць тактыку дзеянняў. У шэрагу краін хуткая дапамога наогул адносіцца да калямедыцынскай галіны, у якой працуюць валанцёры. Іх задача — не лячыць, а западозрыць стан, які пагражае жыццю і даставіць у стацыянар для аказання там меддапамогі. У нас усё ж такі прадугледжваецца аказанне мінімуму меддапамогі — ажыццяўляецца першы этап лячэння, што значна паляпшае прагноз для пацыента. Узровень падрыхтоўкі тых жа фельчараў дазваляе аказваць дапамогу ў поўным аб'ёме (агляд — пацвярджэнне таго, што патрабуецца далейшае абследаванне, — дастаўка). Для гэтага, па сутнасці, і ўрач не патрэбен. Яны ў нас, як вядома, ёсць у складзе рэанімацыйных брыгад і ў брыгадах інтэнсіўнай тэрапіі. Фельчары ў такой рабочай звязцы з урачом паралельна і навучаюцца, каб выязджаць на выклікі ўжо самастойна.

«Калі чалавеку стала дрэнна з сэрцам, а да яго прыехала звычайная фельчарская брыгада, якой цяжка разабрацца ў электракардыяграме, то яна можа па тэлефоннай сувязі перадаць звесткі на пост кансультанта — урача-кардыёлага, які дапаможа расшыфраваць і вызначыцца з тактыкай далейшых дзеянняў, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай часці станцыі хуткай меддапамогі Павел УДОТ.** — Калі наша брыгада падазрае ў пацыента інсульт, то мае магчымасць звязацца з кансультантам урачом-неўролагам, які таксама прымае рашэнне, куды накіраваць пацыента — на правядзенне высокатэхналагічнай аперацыі ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі або на стандартнае лячэнне ў іншы стацыянар».

Калі медработнік «хуткай» на месцы выкліку сутыкнецца з агрэсіўным пацыентам ці пачуе ў свой адрас пагрозы, то адзінае, што ён павінен зрабіць, — спыніць аказанне меддапамогі і выклікаць супрацоўнікаў міліцыі.

Прыкладна 35 працэнтаў усіх выклікаў звязаны з сардэчна-сасудзістай паталогіяй, 15 працэнтаў — з хваробамі дыхальных шляхоў, 11 працэнтаў — гэта траўмы (аварыі, падзенні з вышыні, атручэнні і г.д.). Такі расклад захоўваецца ўжо даволі працяглы час.

Сёння, калі мы пазвонім па нумары 103, то ніколі не пачуем кароткіх гудкоў, але і трубку могуць адразу не зняць, пакуль дыспетчар не вызваліцца. На жаль, пакуль у службе няма галасавога суправаджэння: маўляў, званок прыняты, дачакайцеся адказу. Таму некаторым здаецца, быццам ніхто не хоча ім адказаць. Насамрэч дастаткова пачакаць максімум 30 секундаў, і дыспетчар прыме званок. Аўтаматычна ў яго на камп'ютары з'явіцца новы экран выкліку. Інфармацыя, якая паступае ад таго, хто звоніць, будзе зарэгістравана. Дыспетчар падчас апытання вырашае, да якога тыпу адносіцца выклік: экстранны, тэрміновы ці неадкладны. Экстранны (падзенне з вышыні, самагубства, дарожна-транспартнае здарэнне і г.д.) перадаецца брыгадзе цягам 4 хвілін. Плюс 15 хвілін на даезд. Тэрміновы (баліць сэрца, цяжка дыхаць і інш.) перадаецца цягам 15 хвілін, плюс 15 хвілін на даезд. Неадкладны (напрыклад, рэспіраторнае захворванне) — цягам 1-й гадзіны, і 15 хвілін на даезд. Паводле статыстыкі, аператыўнасць выканання даездаў па выкліках — больш за 99 працэнтаў.

Ёсць выклікі падманныя, а ёсць неабгрунтаваныя. З першымі ўсё зразумела, за гэта можна быць прыцягнутым і да адміністрацыйнай адказнасці. Адносна другіх дакладнай фармулёўкі няма, але распазнаць іх няцяжка. Скажам, адна справа, калі чалавек выклікае «хуткую» ноччу або калі ён не можа самастойна дайсці да паліклінікі. І зусім іншая — сітуацыя, пры якой дапамогу можна атрымаць у амбулаторна-паліклінічнай установе. Адзін выклік «хуткай» каштуе ў сярэднім каля 600 тысяч. Большасць гэтай сумы складае амартызацыя аўтатранспарту, крыху — заробак, а на лекі прыпадае зусім мала. Неабгрунтаваны выклік — гэта яшчэ работа прыёмнага аддзялення ў стацыянары, абследаванне і аналізы ў тэрміновым парадку. Словам, выкіданне грошай на вецер.

Памер сярэдняй заработнай платы ва ўрачоў «хуткай» складаў летась прыкладна 10 млн рублёў (пры каэфіцыенце сумяшчальніцтва 1,35), у сярэдняга медперсаналу — 7 млн (каэфіцыент — 1,15), у санітараў — 4 млн рублёў.

На жаль, не ўсе жадаюць гэта разумець. Ёсць такія, хто захоўвае прыхільнасць не аказанню прызначэнняў урача паліклінікі, а выклікам хуткай дапамогі. Можна ігнараваць прыём таблетак і замест гэтага ў панядзелак, сераду і пятніцу ў адзін і той жа час выклікаць брыгаду на дом. Прыехалі, укалолі, стала лягчэй, і якая розніца, што нехта тым часам мае патрэбу ў экстраннай дапамозе?

Тым не менш для выклікаў з прычыны галаўнога болю або артэрыяльнай гіпертэнзіі сёння пры паліклініках працуюць 6 брыгад неадкладнай дапамогі (яны выязджаюць на выклікі ў час работы паліклінікі). У складзе такіх брыгад працуе адзін фельчар, які ў выпадку выяўлення неабходнасці транспартавання ў стацыянар выклікае «хуткую».

«Я сам ніколі не буду выклікаць «хуткую» пры тэмпературы 38,5 градуса, — тлумачыць Павел Удот. — Паводле дакументаў, брыгада можа выязджаць, «калі тэмпература не зніжаецца пераральнымі лекавымі сродкамі». Таму дыспетчар, прымаючы выклік з прычыны тэмпературы, спачатку рэкамендуе прыняць лекі. У складанай сітуацыі можа пераключыць пацыента на ўрача-кансультанта... А калі медработнік «хуткай» на месцы выкліку сутыкнецца з агрэсіўным пацыентам ці пачуе ў свой адрас пагрозы, то адзінае, што ён павінен зрабіць — спыніць аказанне меддапамогі і выклікаць супрацоўнікаў міліцыі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Сем пялёсткаў радасці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сімвалічны ключ ад новага дзіцячага сада ўручыў маленькім навасёлам генеральны дырэктар ордэна Кастрычніцкай рэвалюцыі будтрэста №3 горада Салігорска Сяргей Ярмалінскі. Менавіта гэтае прадпрыемства ў сціслыя тэрміны пабудавала аб'ект: конкурс на яго ўзвядзенне быў выйграны ў чэрвені мінулага года.

Новая ўстанова атрымала неафіцыйную назву «Кветачка сямікалерная». Яе эмблемай стала кветка з сямю пялёсткамі. Кожны з іх увасабляе асобны кірунак выхавання гарманічна развітой асобы. Сапраўды, дзіця — гэта пяшчотны парастак кветкі, якая яшчэ не распусцілася. А ў надзейных руках педагога яна квітнее і прыносіць адпаведныя плады.

У яслях-садзе працуюць 12 груп, у тым ліку 4 ясельныя, якія будуць наведваць малыя ад 2 да 3 гадоў. Сярод выхаванцаў і Валерыя, якой хутка споўніцца два з паловай гады.

— Мы жывём разам з бацькамі ў гэтым раёне. І, вядома, задумваліся, куды ўладкаваць дачку, — кажа яе маці Кацярына Савіч. — А тут усе праблемы адпалі. Вельмі зручна як для бацькоў, так і для малых: не трэба рана будзіць, некуды везці дзіця. Радуе і тое, што гэты садок звышсучасны, створаны ўсе ўмовы як для фізічнага, так і духоўнага развіцця дзяцей.

У ТЭМУ

Галіна КАЗАК, начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама:

— За апошнія пяць гадоў на Міншчыне адкрылася 12 дзіцячых дашкольных устаноў на 2730 месцаў. Акрамя таго, пачынаючы з 2011-га 9 дашкольных устаноў створаны за кошт рэканструкцыі і вяртання памяшканняў, якія выкарыстоўваліся разнастайнымі службамі, арганізацыямі, ведамствамі. Вельмі актыўна пачалі развівацца формы прыватных дзіцячых садоў. Летась у Мінскім раёне створаны два такія: у аграгарадку Сеніца на 40 месцаў і ў Бараўлянах на 24 месцы. Сёлета будзе пабудаваны дзіцячы сад у вёсцы Ляскоўка Мінскага раёна.

Што тычыцца дашкольных дзіцячых устаноў крокавай даступнасці, то тут яшчэ існуе праблема ў мікрараёнах-новабудоўлях некаторых райцэнтраў. У прыватнасці, такія цяжкасці адчуваюцца ў Стоўбцах, Маладзечне, Жодзіне. Там запраектавана будаўніцтва новых устаноў, але гэта перспектыва наступнага года.

Дадам, што дзіцячыя сады настолькі запатрабаваны ў Мінскай вобласці, што кожны год мы прырастаем па колькасці дзяцей у іх на 500-700 чалавек. На цяперашні момант 660 дашкольных устаноў наведваюць 58 118 дзяцей.

У гэтых садах працуюць не толькі педагогі, але і псіхолагі, псіхатэрапеўты.

— Адкрыццё дзіцячага сада ў новым раёне, дзе жыве нямала маладых, шматдзетных сем'яў, дазваляе вырашыць праблему крокавай даступнасці ўстаноў дашкольнай адукацыі, — канстатаваў **старшыня Барысаўскага райвыканкама Уладзімір МІРАНОВІЧ.** — Акрамя таго, тут прапаноўваецца 65 новых рабочых месцаў, у тым ліку 29 непасрэдна для педагогаў горада.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Без афіцыйнага даходу — любыя расходы сумніўныя

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У падатковыя органы будзе паступаць інфармацыя аб любых здзелках па набыцці валюты незалежна ад сумы, — адказвае Міхаіл Расолька. — Нейкая мінімальная ці максімальная сума валюты пры гэтым для спецыялістаў падатковай службы не прапісана. Напрыклад, калі чалавек па дакументах нідзе не працуе (не плаціць падаходны падатак), але адначасова мае пэўныя выдаткі, тады падатковая інспекцыя мае поўнае права пацікавіцца ў яго, адкуль былі атрыманы гэтыя фінансавыя сродкі. Гэта тысячы і набыцця валюты. Калі чалавеку ўсяго 20 гадоў, ён студэнт і нідзе не працуе, тады ў падатковай інспекцыі ўзнікнуць пытанні нават у тым выпадку, калі апошні вырашыць набыць у абменніку тысячу ці нават 500 долараў.

Зразумела, што гаворка звычайна не ідзе пра мінімальныя сумы грошай. Падатковая інспекцыя заўсёды адсочвае буйныя пакупкі, набыццё нейкай нерухомасці або дарагога аўтамабіля. У падатковай інспекцыі ёсць інфармацыя аб такіх людзях, якія на працягу многіх гадоў нідзе не працуюць, але выглядаюць вельмі забяспечанымі. Падобную сітуацыю апошнія тлумачаць тым, што жывуць яны за кошт немаладых бацькоў. Аднак часам у падатковай службы ўзнікаюць сумненні наконт рэальнай крыніцы даходаў пры такіх выдатках.

— У рэдакцыйнай пошце апісваўся такі выпадак, калі жанчына пасля продажу дома на вёсцы перадавала грошы зяцю. Апошні клаў гэтыя грошы на дэпазіт у банку, пасля чаго з пытаннямі да яго звярталася ўжо падатковая. Сітуацыя крыху нервовая атрымліваецца...

— Нейкі дакумент аб крыніцы сур'ёзных грошай у чалавека павінен быць абавязкова. Гэта можа быць распіска ад родзіча або нават ад добрага сябра. Калі гэта легальныя грошы, то пытанняў аб рэальнай крыніцы іх набыцця не ўзнікне. У іншым выпадку на такі даход падатковая служба налічыць падаходны падатак у памеры 13% ад сумы.

— У эру электронных плацяжоў усе нашы сур'ёзныя пакупкі магчыма прасачыць. І яны сапраўды фіксуюцца. Але не трэба на конт гэтага хвалявацца. Штогод у Мінску купляецца вялікая колькасць дарагіх аўтамабіляў. Падатковыя органы ўсе такія здзелкі адсочваюць і ўдакладняюць крыніцы даходаў пакупнікоў. Падатковая інспекцыя ніколі не патурбуе тых, чые даходы маюць празрыстую крыніцу.

Цалкам тэкст «прамой лініі» з Міхаілам Расолькам чытайце ў найбліжэйшых нумарах «Звязды».

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

У ГРАМАДСКІЯ ЛАЗНІ ВЕРНУЦЬ «ЛЁГКУЮ ПАРУ»?

Па разліках Мінгандлю, тарыф на іх наведванне павінен складаць да 65 тысяч

Пасля ўмяшання Міністэрства гандлю ў сферу фарміравання тарыфаў на паслугі грамадскіх лазняў асобныя з іх знізілі кошт наведвання на 40 працэнтаў.

Нагадаем, нядаўна было агучана, што цэны ў грамадскіх лазнях патрабуюць дэталёвага вывучэння. Справа ў тым, што ў сувязі з прыняццем урадам краіны пастановы ад 9.01.2016 года №8, якой паслугі лазняў выключаны з пераліку сацыяльна значных, асобныя суб'екты гаспадарання пачалі рэзка падымаць тарыфы на такі від паслуг.

«Згодна са звесткамі маніторынгу, у асобных рэгіёнах кошт двухгадзіннага сеанса ў агульным аддзяленні дасягае 139 900 рублёў (г. Жыткавічы). Пры гэтым аналагічныя паслугі ў іншых рэгіёнах істотна таннейшыя. Напрыклад, у Мінску — 55 тысяч рублёў (КУП «Гарадскія лазні»). У выніку за студзень-люты гэтага года індэкс спажывецкіх цэн у краіне склаў 104,8 працэнта, у тым ліку па паслугах лазняў — 155,8 працэнта (пры ўстаноўленым параметры змянення спажывецкіх цэн на 2016 год не больш за 12 працэнтаў)», паведамляла прэс-служба міністэрства. У сувязі з гэтым Мінгандлю прыступіла да дэталёвага вывучэння парадку і абгрунтаванасці фарміравання тарыфаў.

І вось міністэрства інфармуе, што, напрыклад, у Лельчыцах кошт наведвання грамадскай лазні зніжаны з 103 600 рублёў да 75 тысяч. Па Мінску тарыф на паслугі агульных аддзяленняў лазняў склаўся ў дыяпазоне ад 55 да 65 тысячы рублёў. У абласцях ён вырас практычна ўдвая і складае ад 30 тысяч у Магілёве да 90 тысяч у Барысаве. Найбольш высокі рост тарыфу з пачатку года — у Гомельскай вобласці (ад 2,5 да 3,5 раза), Мінскай вобласці (2,3 раза). За гэты перыяд наведвальнасць лазняў у абласцях скарацілася практычна ў два разы.

Па разліках Мінгандлю, цяпер тарыф на наведванне грамадскай лазні павінен складаць да 65 тысяч рублёў, што пры належнай арганізацыі дазволіць забяспечыць рэнтабельную працу адпаведных прадпрыемстваў. Міністэрства накіравала рэкамендацыі аблвыканкамам, Мінскаму гарвыканкаму аб неабходнасці зніжэння тарыфаў за кошт скарачэння выдаткаў, правядзенні ўзважанай тарыфнай палітыкі на паслугі грамадскіх лазняў з мэтай захавання наведвальнасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Май на ўвазе

МЕСЦАМІ АБМЕЖАВАННІ НА ВОСЬ ЗНЯТЫЯ

З 13 красавіка на шэрагу рэспубліканскіх аўтадарог адмяняецца дзеянне сезонных абмежаванняў нагрузак на вось.

Адпаведную пастанову наконт гэтага прыняло Міністэрства транспарту і камунікацый. Яе дзеянне распаўсюджваецца на наступныя аўтамабільныя дарогі і іх участкі: на ўсе рэспубліканскія дарогі Брэсцкай і Гомельскай абласцей; на ўвесь працяг аўтадарог М3 Мінск — Віцебск і Р20 Віцебск — Полацк — граніца Латвійскай Рэспублікі (Грыгараўшчына); на ўчастку аўтадарог Р3 Лагойск — Зембін — Глыбокае — граніца Латвійскай Рэспублікі (Урбаны): кіламетры 79,125 — 104,869 і Р4 Полацк — Глыбокае — граніца Літоўскай Рэспублікі (Катлоўка): кіламетры 201,742 — 223,160.

ДАДАТКОВЫЯ НА МАЙСКІЯ

На майскія святы Беларуская чыгунка прызначае дадатковыя цягнікі.

У прыватнасці, гаворка ідзе пра міжрэгіянальныя зносіны, дзе ў раскладзе руху з'явяцца 8 дадатковых саставаў, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. Так, 10 мая дадатковыя цягнікі будуць курсіраваць па наступных маршрутах: №713 Віцебск — Мінск, №714 Мінск — Віцебск, №712 Мінск — Брэст, №645 Віцебск — Магілёў, №646 Магілёў — Віцебск. З улікам пасажырапатоку работа па прызначэнні дадатковых саставаў на майскія святы будзе прадоўжана.

Сяргей РАСОЛЬКА.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ

ОАО «ПИВЗАВОД ОЛИВАРИЯ»!

28 марта 2016 года

на годовом общем собрании акционеров принято решение о выплате дивидендов по итогам работы за 2015 год.

Утвержденный общим собранием акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» размер дивидендов, начисленных на 1 простую (обыкновенную) акцию, составляет 81 094 белорусских рубля.

С начисленной суммы дивидендов подлежит удержанию подоходный налог в соответствии с действующим налоговым законодательством Республики Беларусь.

Форма выплаты дивидендов – денежные средства.

Право на получение дивидендов имеют акционеры ОАО «Пивзавод Оливария», включенные в список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров на дату 04 марта 2016 г.

Срок выплаты дивидендов по акциям – **не позднее 30 июня 2016 года.**

Акционерам, которые не имеют открытых счетов **в филиале № 510 ОАО «АСБ Беларусбанк»,** а также акционерам, впервые получающим дивиденды, начисленные по акциям ОАО «Пивзавод Оливария», **необходимо открыть счет в филиале № 510 ОАО «АСБ Беларусбанк»,** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 18а. О номере счета **известить по телефону: (017)239-58-13**.

Акционерам, которые имеют счет в филиале № 510 ОАО «АСБ Беларусбанк», выплата будет производиться перечислением дивидендов на банковский счет.

Для получения дивидендов необходимо обратиться в **отделение 182 филиала № 510 ОАО «АСБ Беларусбанк»** по адресу: г. Минск, ул. Богдановича, 6.

Акционер может получить дивиденды в кассе Общества по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 19 (2-й этаж). Предварительное согласование (не менее чем за 3 дня) до даты получения дивидендов обязательно. Телефон для согласования даты получения дивидендов в кассе Общества: **(017)239-58-13**. Дивиденды выплачиваются лично акционеру при предъявлении паспорта.

УНП 100128525

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

Номер лота по порядку	Местоположение земельного участка	Начальная цена (руб.)	Размер задатка (руб.)	Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения	Условие проведения аукциона	Характеристика земельного участка	Кадастровый номер	Инженерная и транспортная инфраструктура	Дата проведения аукциона	Последний день приема заявлений
1.	Бобруйский район, Сычковский сельисполком, д. Щатково, пер. 3-й Масловского, 8	13 005 212	1 300 521	15 502 094 (расходы возмещает победитель аукциона)	Наличие не менее двух участников	Площадь 0,1313 га	№720884012601000231	-	16.05.2016 г.	06.05.2016 г. до 17.00

ПРИМЕЧАНИЕ: Аукцион состоится в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 61 в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Информация о земельных участках по контактным телефонам в г. Бобруйске: 72-05-40, 71-74-30.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);
- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10% от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома №3600712110013 в АСБ «Беларусбанк» филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;
- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 красавіка 2016 г.
№ 7 (370)

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

НЕ ХВАЛЮЙЦЕСЯ, НЕШТА ПРЫДУМАЕМ

Галоўнае — выслухаць, супакоіць і дапамагчы

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Старшыні Салігорскага раённага Савета дэпутатаў Лідзіі КЛІШЭВІЧ прысвоена ганаровае званне «Жанчына года» ў намінацыі «За лідарства і паспяховае кіраўніцтва» па выніках VIII рэспубліканскага конкурсу. «Для мяне гэта стала поўнай нечаканасцю, — прызнаецца Лідзія Анатолеўна. — Я лічу, гэта не мая асабістая заслуга. Заслуга ўсіх кіраўнікоў арганізацый, мясцовай улады».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Жыхары горада і раёна, якія прыйшлі на прыём грамадзян, перш чым прыступаць да справы, віншавалі старшыню райсавета са значнай падзеяй у жыцці.

А звярнуліся да Лідзіі Клішэвіч са сваімі клопатамі і праблемамі 8 чалавек, у тым ліку трое па пытаннях працаўладкавання.

Шматдзетная маці ў свой час працавала ў сумесным беларуска-галандскім прадпрыемстве, ёй там падабалася, заработная плата задавальняла. Выйшла замуж, нарадзіўся першынец, затым — двойня. Немаўлятак яна вырашыла падгадаваць да пяці гадоў. Былыя наймальнікі не адмаўляюць ёй у прыёме на працу. Але абавязкі менеджара — гэта не толькі работа з кліентамі, заказамі, але і камандзіроўкі, вялікія нагрузкі.

— Мне б што-небудзь больш падыходзячае, пакуль дзеці падрастуць, — папрасіла яна.

— А якая ў вас спецыяльнасць? — пацікавілася Лідзія Анатолеўна.

— Хімік-тэхнолаг па драўніне, — адказала тая.

— У Салігорску няма дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў. Літаральна два тыдні таму ў «Водаканале» былі вакансіі інжынера-лабаранта і лабаранта, але, на жаль, вы спазніліся. Не хвалюйцеся, нешта прыдумаем.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Пётр і Эма ЖУКІ.

СПРАВА КОРМІЦЬ

АВЕЧКІ, ФАЗАНЫ, ПЕТУНІІ...

У Здзітаўскім сельсавеце людзі актыўна развіваюць падсобную гаспадарку

Святлана ЯСКЕВІЧ

Уладзімір Марганюк — патомны ваенны. Яшчэ ў дзяцінстве сям'я за бацькам-вайскоўцам аб'ехала увесь Савецкі Саюз. Уладзімір скончыў вучылішча, служыў у розных гарнізонах, давялося і ў Афганістане паваяваць. Пасля выхаду на пенсію вярнуўся ў родную Бярозу.

Працаваў у горадзе, потым купіў дом на ўскрайку вёскі, амаль што хутар, і стаў уладкоўваць сваю гаспадарку. Спрабаваў самыя розныя напрамкі, нават возера ў арэндзе меў. Кажа, што затраты па зарыбленні не акупіліся, ды і браканьеры даймалі. Таму адмовіўся ад арэнды, зарэгістраваў фермерства і наладзіў... свіны бізнес.

Справы пайшлі нядрэнна, у хляве ўжо налічвалася больш за 300 галоў свіней, у райцэнтры мелася два кіёскі па продажы мяса. А потым, паводле слоў гаспадара, пачалася барацьба з «міфічнай чумой». І хоць Здзітава не ўваходзіць у пяцікіламетровую зону, бо паблізу няма свінакомплексаў альбо фермаў, загад выконвалі спраўна: свіней, якіх не паспеў рэалізаваць, каля сотні галоў, у прадпрымальніка забралі. Але ён не кінуўся ў роспач. Толькі перастаў быць фермерам і пераключыўся на падсобную гаспадарку.

> Людзі не стогнуць ад беспрацоўя, не скардзяцца на зарплату ў сельгаспрадпрыемствах, а заводзяць сваю гаспадарку і атрымліваюць прыбытак.

Цяпер ва Уладзіміра Марганюка невялічкая птушыная ферма: куры самых розных парод, качкі, гусі, індыкі і прыгажуны фазаны. Апошніх, як ён кажа, гадуе для душы. Праўда, нядаўна здарылася непрыемнасць. У хлеў убіліся дзікія норкі. Адна за ноч задушыла больш за 20 курэй, другая — крыху меней, але знішчыла племянную індычку, якую толькі што купіў гаспадар. Аказваецца, у вакольіцы некалі была звяраферма. Як расказваюць мясцовыя жыхары, адтуль паўцякала шмат норак. Яны распладзіліся ў дзікай прыродзе і сталі сапраўднай навалай для вясковай жыўнасці.

Але няўрымслівы гаспадар не страчвае аптымізму. Ён умацаваў хлеўчыкі, пазабіваў нават самыя маленькія дзіркі — цяпер ніякая норка не ўлезе. У хаце стаяць скрыні-інкубатары. Там ужо весела ціўкаюць качаняты, гусяняты, на падыходзе — куранята. Яшчэ ва Уладзіміра Мінавіча ёсць невялічкая чарада авечак. Пасадзіў летась тры рады маліны і малады сад. Кажа, што яму цікава спрабаваць новае. Затраты акупляюцца, нешта застаецца ў якасці прыбытку — значыць, варта займацца справай:

— Ніколі раней не думаў, што ў сталыя гады пераключуся на сельскую гаспадарку. Але на пэўным этапе жыцця становішся амаль філосафам і інакш успрымаеш зямлю. Аказалася, люблю ўсё жывое. Авечкі за мной ходзяць следам, з рук ядуць. А прыгожыя птушкі ўмеюць дзяліцца добрай энергетыкай.

Усе, з кім давялося пагаварыць у гэты дзень, падкрэслівалі, што трэба любіць тое, чым займаешся, інакш не атрымаецца. У гэтым нас пераконвала і Эма Жук, якая з мужам-прадпрымальнікам шмат гадоў займаецца кветкамі. Эма і Пётр маюць прасторную цяпліцу ў двары, дзе вырошчваюць расаду. Цяпер падрастаюць петуніі. А да пачатку сакавіка тут паспелі вырасціць граду цюльпанаў.

Уладзімір МАРГАНЮК.

Расаду ў Жукоў бяруць амаль усе сельсаветы, многія школы раёна. Сваю прадукцыю гаспадары прадаюць на кірмашах у Мінску, Віцебску, Салігорску, іншых гарадах. Работа з раслінамі цяжкая, але ж вяскоўцы прывыклі да працы. Справа сям'ю корміць. Траіх дзяцей, лічы, вывучылі, малодшы сын універсітэт заканчвае. У хаце дастатак, здабыты працоўным мазалём. Гаспадыня (яе поўнае імя Эльміра Веліеўна) сказала так:

— Лічу, што, жывучы ў вёсцы, кожны чалавек можа добра зарабляць і ўтрымліваць сям'ю — пры ўмове, што ён не баіцца працы і што галава сям'і ўсё ўмее рабіць рукамі.

Яшчэ Эма вельмі любіць сваю вёску. Сказала, што па гандлёвых справах яны аб'ехалі ледзь не ўсю краіну, але «Здзітава найхарашэйшае». Бо тут навыперадкі ўпрыгожваюць падворкі. Паміж гаспадынямі ідзе сапраўднае спаборніцтва, чыя сядзіба расквечана найбольш разнастайна. Вясной усе купляюць расаду ў прадпрымальнікаў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЭМА ДНЯ

ДАПАМАГАЕ НЕ КОЛЬКАСЦЬ, А ПАДЫХОД

Новыя формы працы, прыўнесеныя ў работу Саветаў дэпутатаў за апошнія некалькі гадоў, пытанні занятасці насельніцтва і парламенцкія выбары, якія адбудуцца ў хуткім часе, — пра гэта падчас выніковай атэстацыі старшыняў раённых Саветаў дэпутатаў расказала Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі.

Па словах сенатара, у кожным рэгіёне нашай краіны ёсць тое, чаму можна павучыцца ў плане кіравання (на атэстацыі прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх абласцей). Што тычыцца новых падыходаў у працы органаў мясцовага самакіравання, то асабліва Святлана Герасімовіч адзначыла рэгіянальныя сходы дэпутатаў.

— Мы іх ужо не раз праводзілі, і досыць паспяхова. У сходах бралі ўдзел і сенатары, і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Лічу, што па выніках паўгоддзя такія невялікія «саміты» варта праводзіць у кожным рэгіёне, — сказала Святлана Герасімовіч. — Зараз час напружаны. Але ён быў такім заўжды. Акрамя адмоўнага, у раёнах ёсць і станоўчае, і пра гэта трэба расказваць, дзяліцца пазітыўным і сваімі здабыткамі. Ёсць задачы, якія трэба ставіць дэпутацкаму корпусу, актыву, над якімі варта працаваць і надалей. Тым больш што наперадзе значныя палітычныя падзеі — усебеларускі сход і выбары ў парламент.

Парламентарый падзякавала старшыням за плённую працу ў стварэнні маніторынгавых груп пры Саветах дэпутатаў. У іх уключаны і дэпутаты, і прадстаўнікі выканкамаў, якія вядуць пытанні эканомікі ці сельскай гаспадаркі. «Таму ў мяне да вас просьба: не часціць з паездкамі, а рабіць так, каб выязныя мерапрыемствы прыносілі карысць», — падкрэсліла яна. На думку сенатара, добра, калі ў адпаведных справаздачах дэпутатаў будуць не толькі лічбы, але і ўласнае бачанне кірункаў развіцця аграрнага сектара.

— Я хацела б даць параду: часам выязджаць і «кропкава» правяраць, якія цяпер кошты на тарыфы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, як рэалізуецца адпаведны ўказ Прэзідэнта, — прапанавала яшчэ адзін кірунак працы Святлана Герасімовіч. — І калі бачыце праблему — спрыяйце яе вырашэнню. Таксама асаблівую ўвагу варта ўдзяліць пытанням занятасці, звальнення, скарачэння, каб не было тут «асабістых падыходаў». Рашэнні, якія прымаюцца па скаргах грамадзян, лепей прымаць калегіяльна, бо браць такую адказнасць на сябе не заўжды мэтазгодна.

У атэстацыі браў удзел **Марат ЖЫЛІНСКІ, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**. Ён таксама падзяліўся сваім вопытам працы з выбаршчыкамі: «Я не па чутках ведаю, колькі важныя гутаркі з людзьмі, бо сам вяду дэпутацкія прыёмы. Калі ішоў у Палату прадстаўнікоў, то думаў, што буду «лямпачкі ўкручваць». Але самым цяжкім аказалася наяўнасць пытанняў, якія сталі невырашальнымі. Калі ёсць дакументы, матэрыялы, але вырашэння праблемы цяжка дамагчыся. Але ж мы, як дэпутаты, мусім перамагаць і ў гэтым».

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

НА ДВА ГАРАДЫ БОЛЬШ

